# ВАЙСКОВЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ І ЗЛАЧЫНСТВЫ СУПРАЦЬ ПАРАДКУ АДБЫВАННЯ ВАЙСКОВАЙ СЛУЖБЫ Ў СТАТУЦЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА 1529 ГОДА

**В. В. Каляда**
*адвакат Мінскай гарадской калегіі адвакатаў, кандыдат юрыдычных навук*
*г. Мінск, Беларусь*

У артыкуле прааналізаваны вайсковыя (ваенныя) злачынствы і злачынствы супраць парадку адбывання вайсковай службы ў Статуце ВКЛ 1529 г.

В статье проанализированы войсковые (военные) преступления и преступления против порядка отбывания войсковой службы в Статуте ВКЛ 1529 г.

The article analyzes military crimes and crimes against the order of serving military service in the Statute of the Grand Duchy of 1529.

Прававыя нормы, якія рэгулявалі парадак нясення вайсковай службы ў Вялікім Княстве Літоўскім, існавалі яшчэ на пачатку стварэння гэтай дзяржавы, але, як і большасць іншых нормаў права, першапачаткова яны мелі звычаёвы характар. Адпаведна гэтаму і нормы вайскова-крымінальнага права таго часу таксама былі замацаваны ў форме звычая.

Адным з першых пісаных вайсковых законаў быў агульназемскі прывілей-грамата ад 20 лютага 1387 года [1, с. 39-41], які ўсталёўваў абавязковы ўдзел за ўласны кошт феадалаў у вайсковых выправах. Замацаванне парадку нясення вайсковай службы ў пісьмовых законах вымагала ад заканадаўцы адпаведнага замацавання і ахоўных нормаў-санкцыяў за парушэнні вайсковых законаў.

Далейшая тэндэнцыя да замацавання нормаў вайсковага заканадаўства праявілася ў выданні наступных актаў вайсковага заканадаўства, якія паміж іншага ўтрымлівалі і нормы вайскова-крымінальнага характару – вялікакняскай грамаце ад 13 жніўня 1507 году
[2, с. 296-297] і ўставы Брэсцкага сойму 1512 году для гетмана К. Астрожскага [3, с. 506-508]. У прыватнасці, у гэтых дакументах змяшчалася крымінальная адказнасць вайскоўцаў за наступныя віды злачынстваў: уцёкі з войска, рабаванне насельніцтва, бойкі паміж сабой і г.д. Таксама гэтымі дакументамі ўсталёўвалася крымінальная адказнасць і для асоб, якія непасрэдна не пядлягалі вайсковай службе, але павінны былі выстаўляць са свайго надзелу пэўную колькасць ваяроў.

Напрыклад, удовы прыцягвалі да адказнасці ў выглядзе штрафу ў выпадку не высылкі нарматыўнага почату да войска.

Канец XV - пачатак XVI стагоддзяў быў у ВКЛ перыядам падтрыхтоўкі комплекснага заканадаўчага акту – Статута, які павінен быў рэгуляваць разнастайныя сферы публічных і прыватных адносін. Фактычна ў гэты перыяд працэс фармавання тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, эканоміка-палітычным і культурным цэнтрам якога былі старажытныя беларускія землі, быў завершаны. У выніку барацьбы шляхты за свае правы, а таксама імкнення вялікакняскай улады да абмежавання свавольства буйных магнатаў і стварэнні агульнадзяржаўнага прававога поля быў прыняты Статут 1529 году [4], які быў комплексным заканадаўчым актам і рэгуляваў разнастайныя сферы грамадскіх адносін. Нормы Статута былі прысвечаны пытанням дзяржаўнага, шлюбна-сямейнага, крымінальнага, цывільнага, працэссуальнага права. Таксама ў ім змяшчаліся і нормы вайсковага заканадаўства, якія тычыліся пытанняў арганізацыі і дзейнасці Паспалітага Рушэння – галоўнай формы арганізацыі войска ВКЛ на той час, нягледзячы на паступовае пашырэнне выкарыстання наёмных атрадаў.

Раздзел другі Статута 1529 года “Аб абароне земскай” змяшчаў 15 (14 + уступ) артыкулаў, шмат у якіх утрымліваліся ў тым ліку і нормы вайскова-крымінальнага характару, якія прадугледжвалі адказнасць за разнастайныя вайсковыя злачынствы. Тое, што нормы вайсковага права былі размешчаны адразу пасля раздзела “О парсуне господарской” сведчыць на тое, што пытанням абароны дзяржавы надавалася вялікая ўвага з боку тагачаснага заканадаўцы.

Зыходзячы з аналізу нормаў раздзела “Аб абароне земскай” Статута 1529 года, можна ўмоўна вызначыць тры групы нормаў. Нормы першай групы былі прысвечаны пытанням арганізацыі і дзейнасці Паспалітага Рушэння. У дадзеных нормах атрымалі рэгуляванне важныя пытанні. Так, вызначалася кола вайсковаабавязаных. Насуперак распаўсюджанаму меркаванню, нормы Статута вызнавалі вайсковабавязанымі не толькі асобаў шляхецкага паходжання, але і кожнага чалавека, які быў адпаведнага ўзросту і валодаў зямельным надзелам, у тым ліку ўсіх мяшчан і іншых падданых. Гэтае палажэнне, на нашую думку, генетычна звязана з нормамі прывілею 1387 году, які таксама ўсталёўваў усеагульны абавязак па абароне дзяржавы.

Акрамя асабістага ўдзелу, вайсковабавязаныя павінны былі выстаўляць і пэўную колькасць ваяроў. Колькасць ваяроў, якія павінны былі выстаўляцца з пэўнага памеру зямельнага надзелу, вызначалася асобна ўхваламі сойму і магла вагацца. Таксама прадугледжвалася, што

ўбогія баяры і мяшчане, якія не мелі ў залежнасці “ни одного чоловека” павінны былі з’яўляцца да войска асабіста ў той экіпіроўцы, як маглі, альбо як было вызначана вялікім князем. З мэтаю ўпарадкавання размеркавання вайскоўцаў па атрадах былі заканадаўча замацаваны пэўныя крытэрыі, адпаведна якім вызначалася, у якой харугве альбо атрадзе вайсковец павінен быў заняць месца. Вызначаўся таксама парадак вырашэння пэўных прававых калізій, якія маглі ўзнікнуць пад час мабілізацыі войска.

З мэтаю падвышэння баяздольнасці Паспалітага Рушэння нормы Статуту ўсталёўвалі нарматыўнае ўзбраенне для выстаўляемых зямянамі ваяроў, якія павінны былі быць на добрым кані, коштам не менш за 4 капы грошаў, у панцыры і прылбіцы, з кордам, павезкаю і кап’ём.

Было ўрэгулявана таксама і пытанне вызвалення ад вайсковай службы ў выпадку фізічнай немачы вайсковаабавязанага.

Да гэтай жа катэгорыі адносяцца і нормы, якія вызначалі кампетэнцыю гетмана і харунжага, удакладнялі іх правы і абавязкі.

Да другой групы нормаў належыць аднесці тыя, што рэгулявалі паводзіны ваяроў пад час непасрэднага выканання вайсковай службы ў дзеючым войску. Так, вайскоўцы павінны былі служыць у войску з той жа зброяй, з якой яны прымалі ўдзел у попісе войска, дбайна несці вартавую службу, не раз’язджацца з войска па маёнтках без дазволу на то вялікага князя альбо гетмана, не чыніць шкоды мірнаму насельніцтву, своечасова з’яўляцца для нясення залогавай службы ў замак, прызначаны вялікім князем альбо панамі-радаю і інш.

Да трэцяй групы можна аднесці нормы ваенна-крымінальнага права, прысутнасць якіх у гэтым раздзеле Статута 1529 года з’яўляецца цалкам лагічным, бо яны былі прызначаны папярэдзіць магчымыя парушэнні заканадаўства з боку вайскоўцаў. Гэтыя нормы рэгламентавалі цэлы шэраг вайсковых злачынстваў. Паколькі выданне Статуту ў значнай меры было звязана з афармленнем фарміравання шляхецкага саслоўя і ягонай палітычнай барацьбой за свае правы, то робіцца цалкам лагічны той факт, што санкцыі за парушэнне з боку шляхты нормаў вайсковага заканадаўства былі досыць мяккімі.

Так, у Статуце вызначалася крымінальная адказнасць за такое парушэнне нормаў вайсковага заканадаўства, як ухіленне ад вайсковай службы. Суб’ектам гэтага злачынства былі ўсе вайсковаабавязаныя асобы, якімі згодна арт.1 другога раздзелу з’яўляліся: “кождый князь и пан, и дворанин и вдова, также иж который сирота, лета зуполныя маючы и земское имене маючы”, таксама да кола вайсковаабавязаных асобаў далучаліся асабіста вольныя “вси мешчане и подданые”.

Аб’ектыўны бок гэтага злачынства складалі наступныя дзеянні: не з’яўленне па загаду гетмана да месца збору заклiканых да вайсковай службы, альбо парушэнне парадку рэгістрацыі з’явіўшыхся да войска.Таксама да аб’ектыўнага боку злачынству залічвалася і парушэнне абавязку: “выправляти на службу военную, колко бы коли надобе было подле уфалы земское, яко на тот час потреба будет вказывати…” (арт.1, р.2).

Трэба зазначыць, што прыбыўшая да войска асоба набывала статус вайскоўца і лічылася выканаўшай свой абавязак па ўдзелу ў Паспалітым Рушэнні толькі па наступленні складанага юрыдычнага факту, які ўключаў наступныя дзеянні:

– прыбыццё да месца збору войска,

– удзел у попісу войска,

– удзел у шыхаванні войска,

–з находжанне ў вайсковым лагеры пасле попісу і шыхавання да атрымання дазволу гетмана на выязд з вайсковага табару.

Асоба, якая парушала хаця б адну з вызначаных вышэй умоваў лічылася за “вайну не служыўшую” і падлягала санкцыям у выглядзе канфіскацыі маёнтка.

Да ліку вайскоўвых злачынстваў таксама належалі злачынствы супраць парадку фармавання вайсковых адзінак (арт.2, р.2). Перш за ўсё гэта злачынства вызначалася парушэннем парадку шыхавання і ўмоваў адбывання вайсковай службы. У сярэдневечным войску асноўнай тактычнай адзінкай з’яўлялася харугва – атрад феадалаў-апаўчэнцаў, які складаўся з прадстаўнікоў пэўнага павету, альбо васалаў буйнога магнату. Тэрытарыяльнае размеркаванне вайскоўцаў па атрадах было характэрным для тых часовых войскаў і дазваляла ў пэўнай ступені ажыццяўляць кантроль за з’явіўшыміся да войска асобамі і прагназаваць колькасны склад войска.

Згодна з агульным правілам – кожны вайсковаабавязаны землеўладальнік павінен быў станавіцца да харугвы тога павету, на тэрыторыі якога ён быў аселы, калі іншае месца шыхаванне не было яму вызначана гетманам

Шляхціц, які сам быў у складзе роты наёмнікаў, якую ўзначальваў іншая асоба шляхецкага паходжання, павінен быў ставіцца разам з найманай ротай. Разам з тым замест сябе ў тую харугву, да якой быў прыпісаны, павінен быў выслаць якую-небудзь іншую асобу, не вайсковаабавязаную. Часцей за ўсё гэта былі пахолкі з шляхецкіх маёнткаў.

Шляхціц, які валодаў некалькімі маёнткамі, павінен быў шыхавацца ў харугві таго павету, дзе знаходзіўся яго радавы маёнтак –

"имене отчизное головное". Той жа шляхціц, які адначасова атрымаў маёнтак ад пэўнага федала ці ад вялікага князя, павінен быў несці службу ў харугві таго павету, дзез находзіўся гаспадарскі маёнтак. У адваротным выпадку яму пагражала страта гэтага маёнтку на карысць гаспадара.

Шыхавацца шляхціцы павінны былі разам з усімі ўласнымі коньмі і сваімі слугамі адпаведна вызначаных заканадаўствам нормаў прызыву з пэўнага зямельнага надзелу.Таксама яны абавязваліся быць узброенымі адпаведна заканадаўчым нарматывам. У дальнейшым служба павінна была несціся адпаведна занатаванай у попісе колькасці слугаў і коняў.

Такім чынам, аб'ектыўным бокам дадзенага злачынства з'яўлялася: парушэнне ўсталяванага парадку шыхавання, альбо адасланне без дазволу на гэта гетмана сваіх слугаў і коняў дамоў да сканчэння тэрміну вайсковай службы.

Адносна санкцый патрэбна сказаць, што згодна арт. 2 другога раздзелу віды іх адрозніваліся ў залежнасці ад суб'ектаў:

1) шляхціц аселы – падлягаў канфіскацыі маёнтка;

1) афіцэр найманай роты, неаселы – страта гонару;

2) шляхціц аселы, які меў адначасова маёнткі ад феадала і ад князя– за нез'яўленне да харугвы павету, дзе быў вялікняжацкі маёнтак, падлягаў канфіскацыі гэтага маёнтку, а за іншыя парушэнні – нес адказнасць як і просты шляхціц аселы.

Тут трэба заўважыць, што страта гонару для афіцэра найманай роты – фактычна ставіла кропку ў афіцэрскай кар'еры шляхціца, які нават за мяжой меў бы пэўныя праблемы з "працаўладкаваннем" у выпадку атрымання наймальнікам гэткай інфармацыі.

Вельмі важным у Статуце быў пяты артыкул другога раздзелу, які вызначаў злачынствы супраць інтарэсаў службы. Суб'ектам гэтага злачынства мог быць толькі харунжы. Аб'ектыўны бок злачынства складаўся ў пасобніцтве асобе ва ўхіленні ад вайсковай службы, якое праяўлялася ў прадстаўленні харунжым заведама непраўдзівай інфармацыі аб стане здароўя вайсковаабавязанай асобы. У якасці санкцыі прадугледжвалася – канфіскацыя маёнтка.

Даволі спецыфічнай па сваёй прававой прыродзе з'яўляецца норма Статута, змешчаная ў артыкуле сёмым другога раздзелу, у якой ідзе гаворка аб парушэнні гетманам правілаў абыходжання са спазніўшыміся да войска. Менавіта суб'ектам гэтага злачынства з'яўляўся гетман, прычым не ўдакладнялася, які гетман – польны ці дворны.

Аб'ектыўны бок гэтага злачынства складаўся з унясення гетманам да рэестру насуперак нормам арт.7 другога раздзелу, спазніўшыхся да войска шляхціцаў, што пацягнула ўчыненне шкоды з боку ворага.

Крымінальная санкцыя прадугледжвала, што гетман павінен быў кампенасаваць усю ўчыненую па гэтай прычыне непрыяцелем шкоду. Як нам падаецца, норма мела больш дэкларатыўны, чым рэальны характар. Гэта была хутчэй рэкамендацыя, бо ў рэальнасці пасада гетмана было вельмі ўплывовай у дзяржаве і наўрад ці манарх вырашыў бы пайсці на канфлікт з галоўным даводцай войска.

Важным на наш погляд, у адносінах да дысцыпліны ў войску быў дзевяты артыкул раздзелу другога, які ўсталёўваў адказнасць за паборы з вайскоўцаў пад час звальнення са службы. Законам вызначаўся спецыяльны суб’екту дадзенага злачынства – даводца гарнізону. Аб’ектыўны бок злачынства – атрыманне паднашэнняў ад ваенаслужачых за дазвол ад’езду з вайсковай службы па яе заканчэнню. У якасці санкцыі прадугледжвалася – аднабаковая рэстытуцыя ў падвойным памеры ад атрыманага і дадаткова штраф 12 рублёў за аднаго пацярпелага.

Падобным ў гэтым кірунку быў і арт. 10 другога раздзелу, які прадугледжваў адказнасць харунжага за свавольнае пакіданне падлеглага вайсковаму прызыву дома альбо адпушчэнне вайскоўца з войска. Таксама суб’ект гэтага злачынства быў спецыяльны – харунжы. Аб’ектыўны бок выражаўся ў выданні харунжым дазволу застацца дома зямяніну, які падлягаў вайсковаму прызыву, альбо дазвол на выезд з войска зямяніну з боку харунжага адразу пасля шыхавання войска без дазволу на гэта гетмана.

За здзяйсненне гэтага злачынства харунжы падлягаў санкцыі – пазбаўленне пасады харунжага і канфіскацыя на карысць гаспадара маёнтку злачынцы.

Арт. 11 гэтага ж раздзелу ўсталёўваў адказнасць за дэзэртырства з войска. У якасці суб’екта дадзенага злачынства мог выступаць любы ваенаслужачы. Аб’ектыўны бок злачынства складаўся з самавольнага адлучэння з дзеючага войска без дазволу на то вялікага князя альбо гетмана.

За такое злачынства прадуглежвалася наступная санкцыя – канфіскацыя маёнтка.

У артыкуле 12-м гэтага ж раздзелу рэгламентавалася адказнасць за парушэнне парадку нясенне вартавой службы. Суб’ектам дадзенага злачынства з’яўляўся вайсковец, які быў пасланы загадам вялікага князя альбо гетмана пасланы для нясення вартавое службы на вызначанае месца

Аб’ектыўны бок злачынства – не з’яўленне на месца нясення варты або свавольнае пакіданне месца нясення вартавое службы раней заступлення

на варту новага вартавога. Вызначаная санкцыя – канфіскацыя маёнтка і смяротнае пакаранне, ужыванне якіх залежала ад волі манарха.

Артыкулам 13 дадзенага раздзелу ўсталёўвалася адказнасць за не з'яўленне да вызначанага замку ў вызначаны тэрмін даводцы вайсковага адзелу. Суб'ектам дадзенага злачынства з'яўляўся даводца вайсковага адзелу пасланы загадам вялікага князя або паноў-рады з вайсковым адзелам для нясення залогавае службы ў замку. Аб'ектыўны бок злачынства складаўся ў нез'яўленні ў вызначаны тэрмін у прызначаны для нясення залогавае службы замак, за што вінаваты падлягаў санкцыі ў выглядзе канфіскацыі маёнтка.

Спецыяльны склад гэтага злачынства меў месца тады, калі нез'яўленне ў вызначаны тэрмін прывяло да заняцця замка войскам непрыяцеля, або мелі месца іншыя шкодныя наступствы. Санкцыя за гэтае злачынства была цяжэйшай – вінаваты падлягаў не толькі канфіскацыі маёнтку, але і смяротнаму пакаранню.

У артыкуле 14 прадуглежваўся такі від вайсковага злачынства, як збройны наезд на маёнтак з мэтай рабавання шляхецкай маёмасці. Суб'ектам дадзенага злачынства мог быць любы вайсковец. У якасці санкцыі прадугледжваўся штраф у вызначаным памеры.

Норма ч.1 арт. 15 другога раздзелу была скіравана на ахову маёмасці насельніцтва пад час баявых дзеянняў і рэгламентавала адказнасць за рабаванне мірнага насельніцтва. Суб'ектам гэтага злачынства мог з'яўляцца любы вайсковец, які ўчыніў гвалтоўнае адабранне маёмасці ў цывільнага насельніцтва. За гэта злачынства была прадугледжана санкцыя ў выглядзе турэмнага зняволення, плюс кампенсацыя шкоды і плюс выплата штрафу на карысць дзяржавы.

У ч. 2 гэтага ж артыкулу ўсталёўвалася адказнасць вайскоўцаў за злачынствы супраць іншых вайскоўцаў. Аб'ектыўны бок злачынства вызначаўся ў збройным нападдзе на іншага вайскоўца, гвалтоўны наезд на вайсковы абоз або лагер, у выніку якога была ўчынена шкода альбо які-небудзь вайсковец быў паранены. Паколькі дадзенае злачынства было цяжкім і мела значную грамадскую небяспеку, то і санкцыя за яго ўчыненне была вельмі жорсткай – смяротнае пакаранне вінаватага.

Падводзячы вынікі, можна зазначыць, што амаль усе нормы вайсковага крымінальнага права ў Статуце 1529 года былі прысвечаны надзейнай абароне дзяржавы і забеспячэнню належнага прызыву да Паспалітага Рушэння. Яны рэгламентавалі адказнасць менавіта шляхціцаў-апаўчэнцаў за парушэнне парадку прызыву да вайсковай службы ў складзе феадальнага апаўчэння альбо ўхілення ад службы ў ім. Пры гэтым, паколькі выданне Статута ў значнай меры было звязана з афармленнем шляхецкага саслоўя і ягонай палітычнай барацьбой за свае

правы, то можна зрабіць цалкам лагічны вывад, што санкцыі за парушэнне з боку шляхты нормаў вайсковага заканадаўства былі досыць мягкімі.

Неабходна звярнуць увагу на тое, што нормы Статута амаль не ўсталёўвалі адказнасць за вайсковыя злачынствы прафесійных наймітаў, якія на той час служылі ў войску за грошы. Менавіта гэта прыводзіла да неабходнасці прыняцця дапаўняльнага вайсковага заканадаўства, якое б было прысвечана адказнасці ўсіх ваенаслужачых, а не толькі апаўчэнцаў Паспалітага рушэння. Гэта і было зроблена ў іншых заканадаўчых актах, перш за ўсё ў Артыкулах Вайсковых, выдаваемых гетманамі што раз, пасля збору ўсяго войска, якое складалася як з Паспалітага Рушэння, так і з найманых атрадаў. Дзеянне артыкулаў вайсковых у пэўнай ступені кампенсавала недахоп тых нормаў Статута 1529 году, якія ўсталёўвалі адказнасць за вайсковыя злачынствы ўсіх катэгорый ваяроў.

У цэлым жа Статут 1529 года не толькі ўпершыню абагуліў папярэднія нормы вайсковага характару, але ўвеў шмат новага, тым самым паклаў пачатак сістэматызацыі вайсковага заканадаўства ў адзіным законе.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Вішнеўскі А.Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах: са старажытных часоу да нашых дзён / А.Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агульнай рэд. А. Ф. Вішнеускага. 2-е выд., дап. Мінск: Акадэмія МУС, 2003. 320 с.
2. Книга записей № 8 // Литовская метрика. Вильнюс, 1995. С. 296-297.
3. Документы Московского архива Министерства Юстиции / подготовил М. Довнар-Запольский. М.: Товарищество типографии А. И. Мамонтова, 1897. Т. 1. 569 с.
4. Лазутка С. Первый литовский статут 1529 года / С. Лазутка, И. Валиконите, Э. Гудавичус. Вильнюс : Маргираштай, 2004. 521 с.